■ Захад—2017

Актыўная фаза манеўраў

Праходзіць найбольш відовішчная частка сумеснага стратэгічнага вучэння

Баявыя дзеянні па знішчэнні ўмоўнага праціўніка разгарнуліся на палігоне «Ружанскі», што за 25 кіламетраў ад Бярозы. Па задуме дадзенага эпізода вучэння верталёты Мі-8 ліквідуюць радыёлакацыйныя станцыі праціўніка. Толькі перш — разведка цэляў удару і даразведка ад знішчальніка Су-24 і адпаведна верталёта Ка-52 Паветрана-касмічных сіл Расійскай Федэрацыі.

У гэты дзень у небе над палігонам можна было ўбачыць і манеўраны паветраны бой ад знішчальнікаў МіГ-29, і нанясенне ўдараў па пляцоўцы армейскай авіяцыі праціўніка групай Су-25, і нанясенне ўдараў па ўзлётна-пасадачнай паласе ўмоўна варожага аэрадрома звяном Су-34, і выкідванне парамі Як-130 авіяцыйных бомбаў па мішэні, якая імітуе аўтамабільны мост і макеты грузавых машын...

— Ваенна-паветраныя сілы і войскі проціпаветранай абароны завяршылі адпрацоўку мерапрыемстваў першага этапу сумеснага стратэгічнага вучэння, падчас якога ажыццяўлялася кіраванне войскамі ў ходзе дэстабілізацыі абстаноўкі, і прыступілі да выканання задач другога этапу па кіраванні групоўкамі войскаў у ходзе абарончай аперацыі рэгіянальнай групоўкі войскаў, — адзначыў **намеснік камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Андрэй ГУРЦЭВІЧ.**

Як падкрэсліў **назіральнік за вучэннем са Швецыі Томас МОЛЕР,** план вучэння адпавядае заяўленаму загадзя. «Наведваем тыя мерапрыемствы, якія значацца ў плане, дадзеным беларускім бокам, — дадаў суразмоўнік. — Гэта нармальная практыка пры падобных вучэннях. Звычайна так і адбываецца».

Дарэчы, у Швецыі цяпер таксама праводзіцца ваеннае вучэнне. Як растлумачыў эксперт, нічога дзіўнага ён у гэтым не бачыць. Мерапрыемствы падобнага маштабу плануюцца загадзя. Гэта проста супадзенне.

Па словах **назіральніцы з Нарвегіі ад АБСЕ Рагнхілд Вэлле ХУСТАД,** Беларусь увогуле не абавязана была запрашаць на «Захад—2017» назіральнікаў, бо колькасць удзельнікаў у вучэнні не перавышае дазволеныя міжнародныя стандарты. Тое, што беларускі бок зрабіў гэтае вучэнне максімальна адкрытым і празрыстым, па яе перакананні, сведчыць аб шчырасці нашай краіны перад Еўропай, усім светам.

Даслоўна

Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ:

— У апошні час, у тым ліку і ў Беларусі, з'явілася шмат аналітыкаў у ваеннай сферы, большасць з якіх, не ўсе, вядома, нават у арміі не служылі. Я хацеў бы пакінуць без каментарыяў іх выпады і выказванні. Беларусь вельмі транспарэнтна дзейнічае па вучэнні «Захад—2017», запрасіўшы неабходную колькасць назіральнікаў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, міжнародных арганізацый. Поўная адкрытасць абумоўлена не тым, што мы хочам перад кімсьці апраўдацца. І нашым суседзям трэба быць больш адкрытымі.

На палігоне «Асіповіцкі» разгарнуўся яшчэ адзін практычны розыгрыш баявых дзеянняў.

Падраздзяленні бранятанкавых груп 120-й асобнай механізаванай брыгады і 423-га мотастралковага палка Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі — на пазіцыях. Беларускія вайскоўцы разам са сваімі калегамі з суседняй дзяржавы вядуць упарты бой.

— Падчас першага этапу вучэння на дадзеным палігоне вайсковымі часцямі адпрацаваны такія вучэбна-баявыя задачы, як непасрэдная падрыхтоўка да баявых дзеянняў, а таксама вядзенне спецыяльных дзеянняў у прызначаных раёнах адказнасці, — расказаў **прадстаўнік галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл Беларусі падпалкоўнік Сяргей САВІЦКІ.** — У ходзе другога этапу вучэння тут выконваецца комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні жывучасці падраздзяленняў, вядзеца абарончы бой, ракетныя войскі і артылерыя наносяць агнявыя ўдары. Акрамя таго, адбываецца адбіццё ракетных і авіяцыйных удараў праціўніка, яго разгром, праводзяцца контратакі, у ходзе якіх аднаўляецца страчанае становішча.

Ва ўсіх гэтых дзеяннях удзельнічаюць і ваеннаслужачыя 120-й асобнай механізаванай брыгады Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання. Як адзначыў **намеснік камандзіра брыгады па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Сяргей КОРНЕЎ,** з пастаўленымі задачамі вайскоўцы спраўляюцца паспяхова.

— У вучэнні «Захад—2017» на двух палігонах з нашай брыгады задзейнічана каля 600 чалавек: афіцэры, прапаршчыкі, сяржанты, салдаты як тэрміновай, так і кантрактнай службы, — удакладніў Сяргей Корнеў. — У манеўрах удзельнічае і асабовы склад, прызваны з запасу. Ёсць людзі, якія служылі яшчэ ў савецкай арміі, але гэта не перашкаджае ім у пэўных пытаннях даць фору вайскоўцам тэрміновай службы. Кожны з іх павінен валодаць ваенным майстэрствам і ў выпадку неабходнасці быць гатовым абараніць сваю краіну. У гэтыя дні яны вытрымліваюць экзамен перад сваім народам.

Як заявіў **назіральнік за сумесным стратэгічным вучэннем са Швецыі капітан 3-га рангу Мікаел Х'ЯЛЛЕ,** тое, што давялося ўбачыць на палігонах, сведчыць аб якаснай падрыхтоўцы беларускіх і расійскіх ваеннаслужачых. Таксама ён адзначыў, што назіраць за манеўрамі было вельмі цікава.



Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН.
Брэсцкая—Магілёўская вобласці

СКАРБЫ, ЯКІМ ЖЫЦЬ ДОЎГА

На міжнародным кангрэсе абмеркавалі лёс культурных каштоўнасцяў: кніжных, званарскіх...

На Міжнародным кангрэсе «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», які днямі праходзіў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, вяліся гарачыя дыскусіі. Аднак усе яны былі ў адным ключы, з патрыятычным адценнем, — пра важнасць беларускай старажытнай кнігі, пра тое, што яна і сёння працягвае ўплываць не толькі на нашу культуру, але і на культуры многіх іншых народаў.

Праца на кангрэсе вялася адначасова ў розных секцыях, — абмяркоўвалі традыцыі бібліятэчнай справы, гаварылі пра майстэрства і гісторыю кніжнага афармлення, звярталіся і да няпростага лёсу беларускіх кнігазбораў у замежных архівах.

— У мінулым годзе мы адзначылі 950-годдзе першай вядомай нам бібліятэкі — бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора. Там на працягу доўгага часу збіраліся кніжныя скарбы, якія ствараліся на нашай зямлі, — расказаў на пленарным пасяджэнні кангрэса **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ.** Аднак яна, страчаная падчас Лівонскай вайны, была не адзінай, створанай прадстаўнікамі хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях. Найбуйнейшымі з'яўляюцца бібліятэкі Супрасльскага, Лаўрышаўскага і Жыровіцкага манастыроў, якія ў той час перайшлі пад патранат навастворнай уніяцкай царквы. Аднак пасля скасавання царкоўнай уніі былі зачынены і бібліятэкі, а іх фонды аказаліся расцярушанымі па ўсім свеце. Звесткі пра далейшы лёс збораў надзвычай скупыя. Але нават тая інфармацыя, што да нас даходзіць, сведчыць: сабраныя калісьці ў гэтых бібліятэках кнігі працягнулі служыць людзям і грамадству, трапіўшы ў іншыя калекцыі...

Дзейнічалі бібліятэкі і пры цэрквах і касцёлах, пры манастырах. Практычна ўсе гэтыя бібліятэкі на пачатку XIX стагоддзя прыпынілі сваё існаванне, адзначае Раман Матульскі, а іх кніжныя фонды трапілі ў зборы іншых бібліятэк розных краін.

Даследчык гісторыі беларускай кнігі Валерый ГЕРАСІМАЎ расказаў пра важныя юбілеі, якія чакаюцца ў будучыні:

— Кангрэс — гэта падсумаванне развіцця беларускага пісьменства не толькі за апошнія 500 гадоў, але і за ранейшы перыяд. Але калі браць гісторыю апошняга часу, варта прыгадаць, што сёлета мы святкуем 100-годдзе першага Усебеларускага з'езда. 18 снежня 1917 года ён прайшоў у Мінску і стаў падсумаваннем нашаніўскага перыяду адраджэння. Бо прадстаўнікі таго часу — Ластоўскі, Іваноўскі, Луцкевіч — былі грамадска-палітычнымі дзеячамі і прытым з'яўляліся кніжнікамі, бібліяфіламі! Таму гэты перыяд надзвычай багаты на нашы кніжныя выданні па вайсковай, дзяржаўнай тэматыцы. Гэта шматгранныя і шматаспектныя выданні, надзвычай цікавыя, хоць і сціпла афармленыя. У студзені 1919 года — абвяшчэнне Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі. Гэта перыяды апагея нашай дзяржаўнасці, адраджэння — і кніжнасці! Кнігі таго часу, з аднаго боку, з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю, а з другога, маюць вялікае значэнне для нас.

Яшчэ адна адметная секцыя міжнароднага кангрэса была прысвечана кампаналогіі. Тут гаварылі пра сакрэты царкоўнага звона, пра захаванасць такіх рэліквій і пра магчымасць стварэння музея званарскай справы.

— У Беларусі адзначаецца 500-годдзе кнігадрукавання, а ў нас ёсць і званы, якім амаль 500 гадоў, — заўважыла **кандыдат мастацтвазнаўства, каардынатар секцыі па кампаналогіі ад беларускага боку Алена ШАЦЬКО.** — Гэта звон 1598 года, які знаходзіцца ў вёсцы Молатава Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Ён быў выратаваны дзякуючы музейным супрацоўнікам, якія ў 1960-я гады забралі яго ў музей з храма, а ў пазнейшыя часы вярнулі яго. Натуральна, званіць ён не можа, і цяпер гэтаму звону месца ў музеі. Гэта, як і Біблія, наша нацыянальная рэліквія. Таму я выступаю за стварэнне музея званоў.

Салідарная з думкай пра неабходнасць стварэння такога музея і госця з Украіны — **Галіна МАРЧУК, якая з'яўляецца стваральніцай музея званоў у Луцку,** адзінага ва Украіне:

— У кожнай краіне звон мае фальклорную аснову і нацыянальныя рысы. І гэта трэба адраджаць, падтрымліваць, вывучаць і развіваць. Трэба часцей нам збірацца на такіх знакавых форумах, як кангрэс у Мінску. Варта аб'ядноўваць званароў, тлумачыць значнасць традыцыйных званоў, якія цудам захаваліся ва Украіне і ў Заходняй Беларусі.

Галіна Марчук перадала ў дар Нацыянальнай бібліятэцы набор з сямі гліняных званоў, адмыслова зроблены ў Луцку з надпісам «500 гадоў беларускага кнігадрукавання».

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by